**Ігнаценка, Т.** Успаміны, якія трывожаць душу / Т. Ігнаценка // Сцяг Перамогі (Лёзна). — 2021. — 12 лют. — С. 6—7.

# УСПАМІНЫ, ЯКІЯ ТРЫВОЖАЦЬ ДУШУ

*Час няспынна бяжыць наперад, застаюцца ў мінулым і радасныя, і трагічныя падзеі. Вайна назаўсёды пакідае рубцы на сэрцах тых, каму выпала ваяваць. Колькі б гадоў ні мінула, успаміны трывожаць душу: нібы зноў у руках зброя, а навокал свісцяць кулі.*



Менавіта такія карціны ўзнікалі перад вачыма і ў мяне, калі вяла размову з прадстаўніком зусім мірнай прафесіі – лесніком Лёзненскага вопытна-вытворчага лясніцтва І. М. Краўцовым. Сур’ёзны, валявы твар Івана Міхайлавіча выдае ў ім бывалага чалавека, які прайшоў праз выпрабаванні і нямала папрацаваў. У маладыя гады прыйшлося на асабістым вопыце зведаць, што такое вайна. Уяўленні дзяцінства аб ёй складаліся па аповедах школьных настаўнікаў. Дзядулю ж, удзельніка Вялікай Айчыннай, не паспеў распытаць, бо той памёр, калі хлопчыку было толькі 3 гады. Гераічныя і жудасныя эпізоды вайны пабачыў падчас абавязковай службы ў арміі. На тэрыторыі Афганістана тады ішлі баявыя дзеянні. Навабранец І. М. Краўцоў якраз трапіў у тую гарачую кропку.

– Прызвалі нас 30 кастрычніка 1983 года, – успамінае Іван Міхайлавіч, – і адразу адправілі ў «вучэбку» Туркестанскай ваеннай акругі, у Ашхабад, дзе прабылі 4 месяцы. Затым – у Кабул. Калі ляцелі туды, стала вядома, што збілі самалёт з «дэмбелямі», якія вярталіся дадому. Трагічная вестка пасяліла ў сэрцы непазнаную раней трывогу, адчуванне вялікай небяспекі, у якой прайшла затым уся служба. Пасадку нам забаранілі, дабраліся на месца другім рэйсам. З Кабула грузавым верталётам нашу групу даставілі да Джэлалабада, пасля расфарміравалі каго куды. Я апынуўся ў другім батальёне ў горадзе Асадабад, што ў 110 кіламетрах ад Джэлалабада, на самай мяжы з Пакістанам.

Бацькі Івана доўга не ведалі, дзе ён і што з ім. Калі атрымалі доўгачаканы ліст, па штэмпелі вызначылі, і з той хвіліны дні іх напоўніліся асаблівым напружаннем чакання. А малодшы сяржант Краўцоў нёс службу ў мотапяхотным падраздзяленні, і яму разам з іншымі байцамі прыходзілася абараняць калоны савецкіх войск.

– Крыху паваявалі, – працягвае расказваць мужчына. – У фільмах шмат паказваюць, але ўсвядоміць, што гэта такое, можна толькі там. Страх, вядома, прысутнічае. Ты страляеш, у цябе страляюць... Адчуваеш, што б’юць зусім побач, кулі свісцяць, а часам здаецца, што над галавою гудуць раі пчол. Небяспека вось – вось накрые... Але прагудзела – значыць праляцела міма.

Пераадольваць выпрабаванні, па словах былога вайскоўца, дапамагала баявое братэрства. Стаялі адзін за аднаго. Згуртаванасць, узаемавыручка, думка, што цябе заўсёды падтрымаюць, прыкрыюць. Інакш нельга. Афганістан стаў школай мужнасці, дзе ўсё было па-сапраўднаму: ворагі, боль, смерць. Лёс распарадзіўся так, што салдат вярнуўся дадому жывым і нават не параненым.

У роднай вёсцы Зачэрня свайго героя сустракалі мама Ніна Фёдараўна, бацька Міхаіл Якаўлевіч і трое малодшых братоў. Іван уладкаваўся ў мясцовы калгас імя Фрунзе інжынерам-электрыкам (спецыяльнасць атрымаў у Гарадоцкім сельгастэхнікуме яшчэ да арміі), там жа ветурачом рабіў бацька, а маці – даяркай. У калгас на сезонныя работы прыязджалі тады дапамагаць брыгады украінцаў. Сярод іх хлопец нагледзеў сабе нявесту Галіну, з якой стварыў сям’ю. Калі калгаса не стала, І. М. Краўцоў падаўся ў леснікі, на гэтай пасадзе ўжо 17 гадоў. Зараз пад яго началам 2 абходы аб’емам 1300 і 600 гектараў. Да сваіх абавязкаў адносіцца з адказнасцю, справу гэту, як кажа, палюбіў. Жонка ж – мясцовы паштальён. Краўцовы разам 32 гады, вырасцілі дваіх дзяцей. Яўген зараз жыве ў Лёзне і працуе вадзіцелем райгаза,

Ірына – заатэхнікам у СФ «Кляўцы», а на дадзены момант гадуе маленькую дачушку Ніколь, і хутка два гады, як Іван Міхайлавіч і Галіна Мікалаеўна сталі дзядулем і бабуляй.

Сям'я, родная сэрцу вёска, хатняя гаспадарка, праца на ўлонні прыроды, адпачынак з вудаю на рэчцы, ціхае мірнае жыццё – ці не тое, што патрэбна чалавеку, каб радавацца і быць шчаслівым? Вось толькі ніколі не забыць былому воіну-інтэрнацыяналісту таго далёкага посвісту варожых куль. На пытанне, ці змяніліся з цягам часу адносіны сучаснікаў да падзей афганскай вайны і яе ўдзельнікаў, І. М. Краўцоў адказаў, што павага да жывых і памяць пра загінуўшых, несумненна, застаюцца, як і павінна быць.

**Таццяна ІГНАЦЕНКА.**